# Чалавек-экстрым Людміла Шохіна

**Яна ганяе сваю БМВэшку па шашы так, што дaішнікі толькі галовамі пакручваюць: ляціць, бы маланка, але ўсё – па правілах. Гаворыць, што за рулём адпачывае: хуткасць яе супакойвае. У юнацтве займалася альпінізмам. Як толькі гэта стала магчымым, выбралася ў Парыж, пражыла там тры тыдні – знаёмілася з навінамі сучаснай архітэктуры, наталялася гэтым незвычайным горадам. Яна, на мой погляд, вельмі прыгожая. З чыстымі блакітна-шэрымі вачыма, высокая, паважная, як каралева. І вельмі жаноцкая. А справамі займаецца зусім не жаночымі. Яна ўзялася выканаць праект неверагоднага збудавання – узняць над зямлёю крышталь нашай новай Нацыянальнай бібліятэкі. Адважылася на тое, што не рызыкнулі зрабіць мужчыны-інжынеры. У эскізным праекце аўтарамі канструктыўнага рашэння было двое мужчын. Але калі дайшло да ўвасаблення, галоўным інжынерам праекта, яго канструктарам, чалавекам, які ўзяў на сябе ўсю адказнасць, стала Людміла Шохіна. Сёння яна курыруе 10 аддзелаў «Мінскпраекта» і 22 субпадрадныя арганізацыі. І першае маё пытанне да яе было – пра меру адказнасці.**



*– Людміла Мітрафанаўна, зараз, калі яшчэ на слыху катастрофа ў водна-спартыўным комплексе «Трансваль», калі нашы зласліўцы «каркаюць» пра магчымы абвал купала на Камароўцы, асабліва ўзрастае адказнасць пры ўзвядзенні такога унікальнага збудавання, як «крышталь» нашай Нацыянальнай бібліятэкі. Вы – галоўны інжынер праекта. Ці жаночая гэта справа? Яшчэ нейк можна ўявіць жанчыну-архітэктара, якая ўзносіцца ў эмпірэях да формы кітовага хваста ці гранёнага алмазу, хоць свету, памойму, не вядомы ні Німейер, ні Карбюз'е жаночага полу, але запраектаваць такое выключнае збудаванне?!. Вам не страшна адказваць за такую незвычайную будову?*

– Не, не страшна. Прафесіяналізм і вопыт дазваляюць вырашаць і такія складаныя задачы. Аўтары-архітэктары настойвалі, каб у кнігасховішча была выразная форма крышталя, і я палічыла, што гэта магчыма зрабіць. Тут вось *(яна паказала агромністыя, таўшчэзныя папкі з тысячамі чарцяжоў)* 38 тамоў разлікаў па «алмазу». 65 тысяч элементаў трэба было разлічыць толькі на высотнай частцы. Тут без камп'ютэра не абысціся. Але я адчула, што гэта магчыма, і ўчапілася за праект дзвюма рукамі. Вельмі ўжо хацелася, каб такі цікавы аб'ект быў выкананы ў родным «Мінскпраекце». А яго аўтары – Віктар Уладзіміравіч Крамарэнка і Міхаіл Клименцьевіч Вінаградаў зараз ужо не працуюць у нас, у іх уласная архітэктурная майстэрня.

*– Вы з такім захапленнем гаворыце аб архітэктарах! Чаму ж, калі зусім дзяўчом пасля школы апынуліся ў «Мінскпраекце», побач з такімі выдатнымі архітэктарамі, як Леў Пагарэлаў і Любоў Усава, вы пайшлі вучыцца не на архітэктара, а на інжынера? Чаму?*

– Відаць, усё з-за матэматыкі. У школе ў нас быў вельмі таленавіты настаўнік. Ён прапаноўваў нам рашаць суперскладаныя задачы. Дазваляў тым, хто знойдзе рашэнне, не пісаць кантрольных, нават прапускаць урокі. У асноўным я адна іх толькі і рашала. І для мяне быў важны нават не сам вынік. Я атрымлівала асалоду ад самога працэсу пошуку рашэння. Аднойчы ж ён у такі азарт увайшоў, такое ўжо нешта складанае прынёс... Я і так, і гэтак – не атрымліваецца. А потым заснула – і сасніла рашэнне. Ускочыла, запісала яго. Настаўнік проста вачам сваім не паверыў... А ў старэйшых класах прыдбала я «Геаметрыю» Лабачэўскага і самастойна яе вывучыла, чым вельмі ганарылася. Школу я скончыла ў ГДР пры нашым пасольстве (мой айчым быў вайскоўцам). Вучыцца вырашыла ў суднабудаўнічым інстытуце ў Ленінградзе. На ўступных экзаменах мяне папрасілі расказаць, што такое складанне і множанне. Я гавару: «Давайце я вам што-небудзь раскажу з геаметрыі Лабачэўскага». Экзаменатары не захацелі. І так мне сумна зрабілася, што забрала я дакументы і паехала ў Мінск, дзе і пайшла працаваць у «Мінскпраект». Я прайшла ўсе прыступкі будаўнічай лесвіцы, пачы-

наючы ад капіроўшчыцы і да галоўнага інжынера праекта. І ніколі мне не было цяжка, і заўсёды было цікава. Адсюль і вучыцца пайшла ў інстытут, на вячэрні факультэт. «Мінскпраекту» аддадзена больш за 40 гадоў жыцця. І мне шкада, што сёння ён страціў свае былыя моц і веліч. Занадта шмат таленавітых людзей пайшлі з яго, сталі «прыватнікамі».

*– Колькі аб'ектаў пабудавана за гэтыя гады з вашым удзелам?*

– Больш за 100 збудаванняў. І жыллёвы масіў на праспекце Пераможцаў. Там у адным з дамоў – мая кватэра.

*– Ці праўда, што праект бібліятэкі праляжаў гэтак доўга, што ўжо і аўтары на яго забыліся? Маўляў, знайшлі ў ім шмат недасканаласцей, хацелі ад яго адмовіцца наогул? Ці так гэта было?*

– Не, вядома. У апошні год існавання СССР быў аб'яўлены міжнародны конкурс на праект Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. У конкурсе бралі ўдзел многія мэтры. Але вельмі паважанае міжнароднае журы лепшым палічыла твор нашых архітэктараў Вінаградава і Крамарэнкі «за найбольш вобразнае архітэктурнае і тэхналагічнае рашэнне». Віктар Уладзіміравіч і Міхаіл Кліменцьевіч – вельмі таленавітыя людзі. Дастаткова, мабыць, сказаць, што новы мінскі чыгуначны вакзал збудаваны па іх праекце. А таленавітыя і сумленныя архітэктары проста абавязаны абганяць свой час на цэлае пакаленне, інакш іх твор састарэе яшчэ на стадыі праектавання. Праект бібліятэкі абсалютна не падуладны маральнаму зносу. Такога будынка няма сёння ні ў Расіі, ні ў Еўропе.

*– Значыць, так: Крамарэнка і Вінаградаў – своеасаблівыя «разведчыкі будучыні». Але растлумачце мне, прафану, чым так вылучаецца іх праект?*



Тыпавы паверх кнігасховішча.

– Шар – самая кампактная форма ў прыродзе. Такая форма ў кнігасховішча. Зараз пад дах трэба ўзяць 8 мільёнаў кніг, а разлічана яно на 14 мільёнаў адзінак захавання і зможа запаўняцца ў бліжэйшыя 35-40 гадоў. Вось якая ў яго перспектыва. Але галоўнае – час, за які кніга даходзіць да чытача. У зусім нядаўна збудаванай Нацыянальный бібліятэцы Францыі кнігу трэба чакаць гадзіну. А ў нас яна даедзе спецыяльнымі тэлеліфтамі за 15 хвілін. Ды і само кнігасховішча будзе вельмі прыгожым,ззяючым. Яно «ўпішацца» ў зялёную зону, а чытальныя залы выйдуць проста ў парк. Такая бібліятэка з годнасцю будзе прадстаўляць нашу Беларусь ў інтэлектуальным свеце.

*– Вы ў дзяцінстве былі гэтакім дзяўчом-хлапчуком, гарэзай?*

– Ды не. Захаплялася тэатрам, пісала вершы, займалася музыкай, як большасць дзяўчынак. Вось толькі на веласіпедзе гойсала, як шалёная. Прытым, на чужых веласіпедах, бо свайго не было: бацькі баяліся, што разаб'юся, і не куплялі. Я і зараз вельмі люблю веласіпед. І захапленне тэатрам мела працяг. Шмат гадоў я хадзіла ў народны тэатр Палаца прафсаюзаў, удзельнічала ў спектаклях «Мяцеж», «Восем жанчын, якія кахаюць». Тэатр і дагэтуль вельмі люблю. Ды толькі на яго зусім не застаецца часу. Апошняе, што глядзела, – «Дземетрыуса» у Рускім. Я зараз і па суботах, і да позняй начы ўвесь час на будоўлі...

*– Вось і зноў мы пра будоўлю. Дарэчы, як трапілі вы ў гэты праект? Спачатку, на архітэктурным этапе, там працавалі іншыя інжынеры?*

– З моманту перамогі на конкурсе да ўказа Прэзідэнта аб будоўлі Нацыянальнай бібліятэкі прайшло 10 год. Галоўнаму канструктару Леаніду Барысавічу Валчэцкаму ўжо амаль 80 гадоў, і ён больш не працуе ў нас, як і галоўны інжынер праекта Анатоль Антонавіч Бараноўскі. І калі галоўны інжынер «Мінскпраекта» запытаўся ў мяне: «А ты б узялася?», я адказала: «А чаму й не?»

Узяцца ўзялася, але добра разумела, што мне патрэбны моцныя саюзнікі-аднадумцы, прафесіяналы экстра-класа, першнаперш ас па бетоне. Я знайшла такога ў нашым Політэхнічным універсітэце: загадчыка кафедры, прафесара Цімафея Максімавіча Пецольда. Потым мы даведаліся, што ў Полацку ёсць ліцэнзійная камп'ютэрная праграма, і нам узяўся дапамагаць спецыяліст вышэйшага класа, доктар тэхнічных навук, прафесар Дзмітрый Лазоўскі. Мы знайшлі канструктыўнае рашэнне: несупынная вязка арматуры, усё збудаванне нібы клубок, насаджаны на пруток. Канешне, ужываецца спецыяльнае бетанаванне, але я не думала, што будзе так цяжка. Велізарны аб'ём работы: 65 тысяч элементаў – гэта толькі на высотнай частцы будоўлі. Дыяметр стылабата – 180 метраў. А яшчэ першы паверх – 19 тысяч квадратных метраў. І надзвычай сціслыя тэрміны. Мы фактычна праектуем і будуем адначасова. Гэта вельмі вялікая адказнасць. Вельмі цяжка.

*– А што самае цяжкае зараз у вашай працы?*

– Такія звышскладаныя работы павінны людзей аб'ядноўваць, а не наадварот. А я ўжо гаварыла, што «Мінскпраект» зараз не той, шмат таленавітых людзей ён страціў. На нарадзе ў Прэзідэнта на пытанне Аляксандра Рыгоравіча, ці здолеем мы гэта зрабіць, я адказала: «Мы павінны, хто ж яшчэ?» – «А будаўнікі змо-



План першага паверха.

гуць?» – запытаўся Прэзідэнт. – «Гэта ўжо справа іх гонару...»

Тэндэр на будаўніцтва выйграў 7-мы трэст. Купілі ім цудоўную нямецкую апалубку. Але, на мой погляд, нашы будаўнікі не зусім гатовыя выконваць такія складаныя заданні. І вельмі шкада, што з будаўнікамі мы таксама не сталі адзінай камандай.

*– І дагэтуль даводзіцца вырашаць невырашальныя задачы?*

– Зараз самае складанае – паспець зрабіць усё ў тэрмін і спрацаваць па каштарысе. З гэтай прычыны часта на сплю. А здараецца, менавіта ў сне з'яўляецца правільнае рашэнне – як некалі ў школе з той універсітэцкай задачкай. Праектаваць такі будынак вельмі складана, вось і не спіцца. А Пецольд смяецца: я, кажа, ужо даўно не сплю, ужо ўзрост такі.

*– А тое, што будаўнікі працуюць і ў маразы, і пад дажджом, і начамі, і без адпачынку, не можа адбіцца на трываласці, даўгавечнасці, прыгажосці збудавання?*

– Мы не дазваляем рабіць памылкі ў апорнай частцы. Але тэмпы – неймаверныя, і таму брак надараецца. Нешта прыдзецца дапрацоўваць, і плаціць будзе той, хто гэты брак дапусціў.

*– І ўсё ж: што самае цікавае для вас у гэтай працы?*

– Унікальнасць будынка, складанасць канструкцыі яго высотнай часткі, велізарная адказнасць. Усё гэта разам узятае і ёсць Творчасць.

*– Разумею, што вы на працы «і ўдзень і ўночы», але калі здараюцца рэдкія часы адпачынку, што тады робіце?*

– Сустракаюся з сябрамі. І вельмі ўдзячная ім за разуменне і спачуванне. Яны мне дазваляюць нават рыкаць на іх. А раз у два тыдні – парылка. Гэта святое! І таксама з сябрамі. Яшчэ люблю сваю БМВуху, хуткую язду па шашы. Нават у чужой машыне я абавязкова павінна сядзець за рулём.

*– Людміла Мітрафанаўна, зразумела, каб быць на працы 25 гадзін у суткі, трэба быць цалкам вольнай. Каб рабіць нешта унікальнае, трэба, каб нішто не замінала. Калі б быў муж, ён бы хацеў бачыць жонку дома. Калі б было дзіця, яго трэба было б карміць, выхоўваць, прысвячаць яму час, дарыць душэўную цеплыню... Вас настолькі паглынула творчасць, ці проста не сустрэўся мужчына?*

– Не сустрэўся. Толькі бязмежнае каханне магло б зацугляць мяне. Але яно не здарылася. Не думаеш пра гэта ў юнацтве. А з узростам думаеш, вядома, разважаеш, ды, на жаль, не лёс, напэўна...

*– Вы робіце цудоўныя фотаздымкі... Памятаеце, калі зрабілі першы?*

– Так. Я зрабіла яго ў Германіі ў 14 год. Здымала сваіх аднакласнікаў і дарыла ім фотакарткі. А калі пасля інстытута жыла з родзічамі на Камчатцы, якраз святкавалі 225-годдзе Петрапаўлаўска-Камчацкага. Мясцовая газета аб'явіла фотаконкурс. І я атрымала 2-е прызавое месца за здымкі «Начны горад» і «Даліна гейзераў». З тае пары і здымаю.

*– Калі вы адчуваеце сябе шчаслівай? Што патрэбна вам для шчасця?*

– Адчуванне радасці існавання заўсёды са мной. Я люблю жыццё, люблю людзей. Я жыву ў суладдзі з сабою. Мне не сорамна за тое, што было са мной у жыцці. І жыць мне ЦІКАВА!

Я не разумею людзей, якія ўсё жыццё хочуць прасядзець у ціхай затоцы. У такім жыцці я не бачу сэнсу. Навошта ты тады прыйшоў на гэтую зямлю?! І з узростам я зразумела, што была неабходная заканамернасць у тым, што не трапіла ў суднабудаўнічы. Мне наканавана была прафесія будаўніка. Самыя велічныя караблі, калі адпрацуюць свой тэрмін, становяцца на прыкол, іржавеюць, і іх рэжуць на металалом. А цудоўныя збудаванні стаяць стагоддзямі: піраміды, Луўр, Ісакій, тварэнні Растрэлі. Мы захапляемся імі і адчуваем, што яны – жывыя. Яны і сёння захоўваюць энергетыку тых, хто іх будаваў, хто да іх дакранаўся. Добрая энергетыка даходзіць да нас праз стагоддзі. Што можа быць цудоўней за гэта?!

Прымаць удзел у стварэнні такога збудавання, як Нацыянальная бібліятэка Беларусі, – дзеля гэтага варта жыць. Такая вялікая справа цалкам апраўдвае тваё існаванне на зямлі. І ці можа быць помнік больш пачэсны? Ці не так, Людміла Мітрафанаўна?

***Гутарыла Мая Гарэцкая.***



*План кнігасховішча.*



*Вертыкальны разрэз.*